## ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА М. Л. МУРАШКІ і Р. Ф. МАХНОВА



**Міхаіл Мурашка і Радзімір Махноў, кіраўнікі падпольнай групы**

**Перыяд дзеяння:**

лістапад 1941 г. – жнівень 1943 г.

**Месца дзеяння:**

г. Віцебск, гарадская ўправа, медыцынскія ўстановы

**Колькасць:**

13 чалавек

**Кіраўнікі:**

Мурашка Міхаіл, Махноў Радзімір

Дзейнічала з лістапада 1941 г. да жніўня 1943 г. Налічвала 13 чалавек, сярод якіх былі пераважна медработнікі. Кіраўнікі: былы загадчык кафедры судовай медыцыны Віцебскага медінстытута М. Л. Мурашка і ўрач Ветрынскай раённай бальніцы Р. Ф. Махноў.

Як загадчык аддзела аховы здароўя гарадской управы Мурашка ўладкаваў на работу ў лячэбныя ўстановы горада патрыятычна настроеных людзей: інспектарам санстанцыі прызначаны Махноў, галоўным урачом гарадской бальніцы (па вуліцы Лабазнай, цяпер Чайкоўскага) – Н. І. Чарткоў, урачамі М. Б. Мурашка, Л. Я. Пасвянскі, на пункце аховы здароўя цагельнага завода – Г. І. Багданава, В. І. Турок, на Бараўлянскім урачэбным участку і ў Лёзненскай бальніцы – У. М. Велічэнка і І. І. Папоў. Службовае становішча дазваляла Махнову наведваць лагеры ваеннапалонных, выяўляць камандзіраў і палітработнікаў Чырвонай арміі, найбольш слабых чырвонаармейцаў і пад выглядам хворых на тыф размяшчаць іх у бальніцах горада.

Вясной 1942 г. Мурашка і Махноў прадухілілі знішчэнне тыфозных хворых у Веліжы. 12 сакавіка 1942 г. гітлераўцы вывезлі з Веліжа 24 ваеннапалонных, у тым ліку цяжка параненага палкоўніка, якіх размясцілі ў бальніцах па вуліцы Лабазнай і на Маркаўшчыне. У красавіку 1942 г. члены падпольнай групы К. С. Акаловіч з дапамогай падпольшчыкаў групы Мурашкі – Махнова вывелі ваеннапалонных да партызан. У студзені 1943 г. Махноў перайшоў працаваць у тыфозную бальніцу ў в. Якуціна.

Тут пад выглядам тыфозных хворых змяшчалі ваеннапалонных, арыштаваных партызан і падпольшчыкаў, моладзь, якой пагражаў угон у Германію. Група забяспечвала медыкаментамі, перавязачным матэрыялам, хірургічным інструментам партызан Сіроцінскага раёна, праз сувязную В. П. Брухнову – партызан брыгады «Аляксея» (А. Ф. Данукалава), праз П. І. Гаўберг-Іванову – падпольную групу Л. Д. Бярозкінай, праз Н. П. Круглову, Д. Е. Цяпкіну, М. Д. Вінічэнка – падпольную групу М. К. Свечкінай. Па заяўках урача Папова (з Лёзненскай бальніцы) М. К. Свечкіна і Н. І. Воранава двойчы атрымалі вялікую колькасць медыкаментаў з аптэчнага склада ў Віцебску. З інфекцыйнай бальніцы медыкаменты прыносіў урач І. А. Пруднікаў.

У жніўні 1943 г. гітлераўцы арыштавалі і пасля катаванняў расстралялі В. П. Брухнову, Р. Ф. Махнова, М. Л. Мурашку, у лістападзе загінула М. Б. Мурашка.

Махноў, Велічэнка і Чаткоў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група М. Л. Мурашкі і Р. Ф. Махнова / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў

Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 494.

2. **Коммунисты** собирают силы // Витебское подполье / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко. – Минск, 1969. – С. 40–56.

3. **Подпольная** группа Мурашко М. Л. и Махнова Р. Ф. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 292–293.

4. **Юшкевич, М. Д.** Подпольная группа медиков / М. Д. Юшкевич // Через годы и столетия: летопись Старосельского края / М. Д. Юшкевич. – Витебск, 2012. – С. 97–98.